УДК 947.6 «19»

І. М. Рыжанкоў, асістэнт

# БЕЛАРУСКАЕ СЯЛЯНСТВА Ў ТРОХ РАСІЙСКІХ РЭВАЛЮЦЫЯХ: ДА ПАСТАНОЎКІ ПРАБЛЕМЫ

The article touches upon the problem of history of social behaviour genesis (moods, expectations, reactions) of Belarusian peasantry at the time of three Russian revolutions. This history hasn't been investigated on the problem of its contents, so it is quite topical for scientific research. The analysis of native and foreign historiography reveals some shortcomings in investigations of problems concerning conditions of the research: methodological schematism, limited access to special store-houses etc. Only analysis based on principles of objectivity and scientific accuracy, development of specialized terminology, consideration of psychological and mental aspect, creation of documentary data on the history of agrarian movement will allow to see this problem in the perspective to get its all-round and objective description.

**Уводзіны.** Праблема даследавання гісторыі генезіса сацыяльных паводзін беларускага сялянства ў перыяд трох расійскіх рэвалюцый па сваёй пастаноўцы і зместу падаецца слаба вывучанай. Аналіз гістарыяграфіі пытання дазваляе акрэсліць прагалы ў вывучэнні сялянскай праблемакі і прычыны іх узнікнення.

**Асноўная частка.** Варта адзначыць, што сялянскай праблематыкай перыяду рэвалюцыі 1905–1907 гг. цікавіліся нават сучаснікі. Так, з 1907 г. выходзяць працы Б. Весялоўскага «Крестьянский вопрос и крестьянское движение в России (1902–1906 гг.)», С. Пракаповіча «Аграрный кризис и мероприятия правительства...», «Аграрное движение в России в 1905–1906 гг.», дзе ўпершыню акрэслены маштабы, этапы аграрнага руху ў Расіі, часткова на Беларусі. Мала таго, тыповая рыса названых прац праяўлялася ў наданні сялянскім выступленням (патраў, парубак і інш.) пераважна эканамічнага характару і ўлік іх лакальных асаблівасцяў. Упачатку 20-х гг. укараненню марксісцка-ленінскай гістарычнай канцэпцыі патрабаваўся пэўны час, у тым ліку рэпрэсіўных мерапрыемстваў. Таму сялянскае пытанне рэвалюцый 1905–1907 гг. разглядалася беларускімі навукоўцамі ва ўмовах адноснага плюралізма думак. Апошняе выявілася ў выхадзе прац вядомых грамадска-палітычных і навуковых дзеячоў Беларусі М. В. Доўнар-Запольскага «Народное хозяйство Белоруссии 1861–1914 гг.», У. М. Ігнатоўскага «Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пач. XX ст.», С. Агурскага «Очерки по истории революционного движения....». Цікавым падаюцца падыходы даследчыкаў адносна слаба акрэсленых класавых супярэчнасцяў у вясковым грамадстве пачатку XX ст.

У гэтыя ж гады складвалася крынічная база даследавання. Трапляюцца зборнікі дакументаў і матэрыялаў, практычна пазбаўленыя кан'юнктурнага адбору. Так, у 1926 г. убачыў свет зборнік архіўных матэрыялаў фондаў Дэпартамента паліцыі Міністэрства ўнутраных спраў – «1905 год у Беларусіі» пад рэдакцыяй С. Агурскага. Акрамя зваротаў мясцовых камітэтаў ПС-Р, дакладаў паліцэйскіх чыноў, у ім была размешчана справаздача мінскага губернатара П. Р. Курлава аб характары і маштабе «сялянскіх беспарадкаў». Таксама каштоўным варта прызнаць зборнік Л. Н. Майзеля «1905–1907 гг. на Беларусі», дзе размешчаны петыцыі вясковых грамадстваў да Савета Міністраў.

Што тычыцца маскоўска-ленінградскага навуковага цэнтра, то тут распрацоўка дадзенай праблемы ажыццяўлялася з больш актыўным запазычаннем ленінскіх цытат. Так, названая рэвалюцыя трактавалася як «генеральная рэпетыцыя» да Кастрычніцкай рэвалюцыі, у ролі кіраўніка выступаў рабочы клас і яго саюзнік бяднейшае сялянства, якіх узначальвалі бальшавікі ў барацьбе з царызмам, памешчыкамі, кулакамі і інш. Нягледзячы на пэўны схематызм рэвалюцыйнага працэсу і класавы падыход, значны ўклад у распрацоўку аграрна-сялянскай праблематыкі ўнеслі савецкія навукоўцы Я. А. Марахавец («Крестьянское движение и социал-демократия в эпоху первой русской революции»), А. В. Шастакоў («Бунт земли...»), П. М. Першын («Аграрная рэвалюцыя...»), якімі быў узняты каштоўны масіў фактычнага матэрыялу.

З выхадам «Краткого курса истории ВКП(б)» рэгіянальныя навукоўцы, у тым ліку беларускія, павінны былі на мясцовым матэрыяле пацвярджаць доказы старэйшых таварышаў. Цікава, што ўпачатку 50-х гг. сялянскае пытанне рэвалюцый 1905–1907 гг. загучала ў тэматыках кандыдацкіх дысертацый. Прычым даследаванні выконваліся па матэрыялах асобных губерняў – Харкаўскай, Варонежскай і інш. У цэлым навукоўцы мусілі завышаць ролю бальшавікоў на вёсцы, настойвалі на палітычным характары сялянскага руху і інш. У ліку аўтараў гэтага накірунку М. П. Пашынцаў («Рабочие и крестьяне Могилевской губернии в период революции 1905–1907 гг.»), К. П. Пятроў («Крестьянское движение в Витебской губернии...»), В. Рудая («Революционное движение в Гродненской губернии...»).

У пасляваенны час вяртаецца традыцыя выдання з нагоды святкавання юбілею рэвалюцыі

1905 г., што суправаджалася хваляй манаграфій, зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, наладжваннем круглых сталоў, канферэнцый і нават выхадам навукова-папулярных твораў. Да 50-гадовага юбілею рэвалюцыі Акадэмія навук СССР выдае, як гэта можа здацца, грунтоўную калектыўную працу «Революция 1905–1907 гг. в национальных районах России». У прыватнасці, практычна ўпершыню закранута пытанне аб дзейнасці Сялянскага Саюза на Беларусі, а таксама аб дамінаванні яўрэйскага насельніцтва ў гарадах і мястэчках. У той жа год пабачыў свет зборнік артыкулаў Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК КПСС «Первая русская революция 1905–1907 гг.», у якім пераважная ўвага надавалася тлумачэнню ленінскай трактоўкі растаноўкі класавых сіл у рэвалюцыі.

На год пазней выходзіць «Крестьянское движение в революции 1905–1907 гг.» С. М. Дуброўскага, у якой беларуская тэматыка практычна не закраналася. У гэтыя ж часы выдаюцца грунтоўныя хронікі рэвалюцыйных падзей, зборнікі дакументаў і матэрыялаў па рэвалюцыйнаму руху на Беларусі і па Расіі ў цэлым. Таксама, пад 50-ю гадавіну друкуюцца публіцыстычныя творы агітацыйна-прапагандысцкай скіраванасці, якія нагадвалі аб ролі пралетарыяту і бальшавікоў у сялянскім руху. У ліку аўтараў Е. П. Лук'янаў, А. І. Воранава, З. Ю. Капыскі і інш.

Сапраўдным адкрыццём для айчыннай і нават савецкай гістарыяграфіі стаў выхад у 1962 г. манаграфіі К. І. Шабуні «Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии». Даследаванне насычана каштоўным фактычным матэрыялам аб становішчы сельскай гаспадаркі і сялянскіх выступленняў пач. XX ст. Разам з тым асноўная энергія даследчыка была скіравана на доказ панавання перажыткаў феадалізма на вёсцы і яе маёмаснай дыферэнцыяцыі. Асвятленне аграрнага руху ў гады рэвалюцыі 1905–1907 гг. праходзіла выключна ў кантэксце сялянскіх патраў і парубак, дзейнасці бальшавікоў. У працы замоўчвалася актыўнасць іншых сацыялістычных партый (БСГ, ПС-Р, БУНД і інш.), кааліцыйных камітэтаў, Сялянскага саюза і інш. Не пацвярджаліся статыстыкай аўтарскія высновы аб палітызаванасці сялянскіх выступленняў, слаба асветлена петыцыйная кампанія вяскоўцаў Беларусі.

Разам з тым твор К. І. Шабуні не згубіў актуальнасці нават да часу абвяшчэння незалежнасці Беларусі. Таму невыпадкова, з часу выхаду яго манаграфіі аграрны рух 1905–1907 гг. набыў фрагментарнае асвятленне, як правіла, у кантэксце дзейнасці бальшавікоў або выбараў у Дзяржаўную думу. У ліку навукоўцаў У. К. Гінёў («Борьба за крестьянство и кризис неонародничества 1902–1914 гг.»), А. С. Кароль «Большевики Белоруссии в революции 1905–1907 гг.», У. І. Салашэнка («Большевики в борьбе с мелкобуржуазными партиями...»), М. А. Марцюхова («На переломе революции: общественно-политическое движение в Белоруссии....»).

У 70–80 гг. гістарычны друк СССР папаўняецца мноствам новых даследаванняў: аб дзейнасці Саветаў дэпутатаў і Дзяржаўнай думы у Расіі (Н. І. Васільева), агляды савецкай і замежнай гістарыяграфіі першай рэвалюцыі (А. П. Пятроў, Б. Марушкін, Я. Д. Чармінскі). У 1987 г. маскоўскія навукоўцы паспрабавалі выдаць абагульняючую працу па сялянскай праблематыцы ў трох рэвалюцыях (В. Г. Цюкаўкін, Э. М. Шчагін) з панаваўшых метадалагічных падыходаў, не прасунуўшы тэматыку наперад.

Істотным чынам сітуацыя змяняецца з канца 80-х – пач. 90-х гг., калі ў расійскай гістарыяграфіі назіраецца тэндэнцыя да перагляду вызначэння «першая руская рэвалюцыя» або «першая расійская рэвалюцыя» да новых трактовак, адпаведна як «першая рэвалюцыя ў Расіі 1905–1907 гг.» або «рэвалюцыя 1905–1907 гг.». Можна пагадзіцца з дэмакратычнасцю гэтых фармулёвак, паколькі яны дазваляюць улічыць лакальныя асаблівасці і адрозненні ходу рэвалюцыі.

У выданнях Расіі апошніх часоў узнімаецца пытанне аб выпрацоўцы новых падыходаў вывучэння сацыяльнай гісторыі, пошуку найноўшай метадалогіі і асэнсаванне тых падзей з улікам маральна-псіхалагічных аспектаў. У гэтай сувязі варта ўзгадаць калектыўныя творы: «1905 год – начало революционных потрясений в России XX века», «Первая революция в России. Взгляд через столетие», «Деревеня в начале века: революция и реформа», Л. Т. Сенчакоў «Приговоры и наказы российского крестьянства 1905–1907 гг...» і інш. Таксама метадалагічна каштоўнай нам уяўляецца праца А. Р. Бухаўца «Социальные конфликты и крестьянский менталитет в Российской империи начала XX века...», выкананая на аснове матэматычных метадаў і контэнт-аналізу.

У гэтай сувязі некаторы рух да новага пераасэнсавання сацыяльнай гісторыі здзейсніў перспектыўны гродненскі навуковец С. М. Токць, які выкарыстаў інтэрдысцыплінарны падыход і інш. [1]. Карысны, сістэматызаваны фактычны матэрыял змешчаны ў табліцах II тома калектыўнага твору «Гісторыя сялянства Беларусі. Са старажытных часоў да нашых дзён...». Працягваючы думку, трэба ўзгадаць зборнік матэрыялаў канферэнцыі БДПУ імя М. Танка, выдадзены з нагоды 100-годдзя рэвалюцыі 1905–1907 гг. [2].

Асвятляючы праблему гістарыяграфіі сялянства Беларусі ў трох рэвалюцыях, варта закрануць даследаванні, прысвечаныя аграрнаму руху ў паслярэвалюцыйны перыяд і ў гады Першай сусветнай вайны. У манаграфіі А. М. Анфімава «Российская деревня в годы первой мировой

войны (1914–1917 гг.)» 1962 г. размешчаны статыстычны матэрыял аб становішчы сельскай гаспадаркі, у тым ліку на Беларусі, у гады I сусветнай вайны і напачатку міжрэвалюцыйнага перыяду. Абагульняючы, неабходна адзначыць, што ў даследаваннях Ц. Я. Саладкова «Борьба трудящихся Белоруссии против царизма (1907–1917 гг.)», А. П. Ліпінскага «Классовая борьба в белорусской деревне 1907–1914 гг.» і «Крестьянское движение в Белоруссии в 1914–1917 гг.», Э. М. Савіцкага «Революционное движение в Белоруссии (август 1914 – февраль 1917 гг.)» складана пагадзіцца з характэрнай для іх тэрміналогіяй вызначэння сялянскага руху з 1907 г., як «разгортванне сацыяльнай вайны», прынамсі супраць кулакоў і аб наспяванні быццам рэвалюцыйнай сітуацыі на вёсцы пад люты 1917 г.

На сучасным этапе часткова сялянскі рух асветлены Ю. Весялоўскім «Беларусь у Першай сусветнай вайне», а таксама з новых метадалагічных падыходаў расійскім навукоўцам В. С. Поршневай «Менталитет и социальное поведение крестьянства, рабочих и солдат России в период Первой мировой войны 1914 – март 1918 гг.».

Распачынаючы асвятленне прац, прысвечаных аграрнаму руху перыяду Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, варта адзначыць, што з першых год у гістарыяграфіі пытання дамінавала рабочая і салдацкая праблематыка, а тэма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, у тым ліку становішча сялянства, на доўгія гады набыла другаступенны, фонавы характар.

Так, у 20–30 гг. у мемуарах бальшавікоў і ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху на Беларусі змястоўна асвятляецца дзейнасць салдат – найбольш рэвалюцыйнай, на іх думку, сілы. Тым не менш ужо тады ў брашурах і артыкулах В. Кнорына, А. І. Зюзькова былі закладзены асновы канцэпцыі развіцця рэвалюцыі на Беларусі – ролі ў ёй сялянства. З усталяваннем сталінскіх метадаў кіраўніцтва навукай вывучэнне гісторыі Беларусі 1917 г. запаволілася і ўсё больш ідэалагізавалася. Неўзабаве тыя сюжэты гісторыі рэвалюцыі, дзе асвятлялася дзейнасць іншых, небальшавіцкіх сіл, набылі негатыўнае адценне. Да прыкладу, у працы Ц. Гарбунова «Воссоединение белорусского народа...» Лютаўская рэвалюцыя не прыгадваецца ні адзіным словам.

У цэлым з пачаткам хрушчоўскай «адлігі» ў краіне ўзніклі больш спрыяльныя ўмовы для развіцця гістарычнай навукі, у тым ліку па сялянскай тэматыцы. Прыкметнай з'явай такога кшталту стала манаграфія Ф. А. Зеляноўскага, у якой разам з традыцыйным перабольшваннем антыўрадавых настрояў і бальшавіцкага ўплыву ў беларускай вёсцы справядліва адзначалася пераважаўшая папулярнасць эсэраўскай аграрнай праграмы. Манаграфія Е. П. Лук'янава [3] пэўным чынам паўтарала асобныя высновы папярэдняга аўтара, у прыватнасці, у наданні восеньскаму аграрнаму руху палітычнага падтэксту і інш. У цэлым праца была выканана з выкарыстаннем мноства дакументальных матэрыялаў, што дазволіла ахарактарызаваць таксама грамадска-палітычны рух.

У 1959 г. выйшаў у свет твор І. Я. Марчанкі «Аграрные преобразования в Белоруссии в 1917–1918 гг.». Асвятляючы памешчыцкую і сялянскую гаспадаркі ў названы перыяд, навуковец змясціў багаты статыстычны матэрыял, але не зрабіў спасылак на крыніцы. Погляды беларускіх даследчыкаў на сялянскую тэматыку фарміраваліся пад уплывам маскоўскіх і ленінградскіх калег – А. Уценкова, Ю. Гарачава і інш. На думку П. Н. Собалева, аграрныя правапарушэнні з'яўляліся прыкметай рэвалюцыйнасці сялянства і фактарам збліжэння з пралетарыятам. Такія ж тэндэнцыйныя звесткі і высновы ўласцівы працы Х. А. Ерыцяна, дзе ўплыў бальшавікоў на вяскоўцаў значна перабольшваўся. У ліку прац пачатку 1960-х гг. высокай для таго часу ступенню аб'ектыўнасці вылучалася манаграфія П. В. Валабуева «Экономическая политика Временного правительства». Хоць навуковец і не займаўся аграрным рухам, тым не менш даваў уяўленне аб стаўленні сялян да харчовай палітыкі Часовага ўрада.

У 1962 г. у Мінску выйшла манаграфія І. М. Ігнаценкі «Беднейшее крестьянство – союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии». Маштабнасць твора ўзмацнялася шырокім спектрам узнятых праблем: дзейнасцю партый на вёсцы, выбарамі ва Устаноўчы сход, усталяваннем Савецкай улады, скліканнем Усебеларускага з'езда і многім іншым. У той самы час аўтар, паставіўшы задачай «вывучэнне бліжэйшых саюзнікаў рабочага класа – пралетарскіх і напалову пралетарскіх мас вёскі», не надаў належнай увагі сацыяльна-эканамічнаму становішчу гэтых пластоў і, асабліва, іх узаемаадносін з «пралетарыятам», напрамкам і формам іх узаемадзеяння. Наогул сялянская тэматыка ў харчовых праграмах дзяржавы закранаецца аўтарам рэдка – у кантэксце аграрнага руху ці дзейнасці бальшавікоў. На нашу думку, без асвятлення гэтай праблемы аб'ектыўная характарыстыка жыццядзейнасці сялянства, у тым ліку бяднейшага, немагчыма.

У пачатку 1980-х гг. адным з новых аб'ектаў навуковых даследаванняў савецкіх гісторыкаў В. І. Кастрыкіна, І. І. Старцава, Т. М. Кітанінай стала дзейнасць Часовага ўрада, з шматгранай характарыстыкай сацыяльна-эканамічнага становішча Расіі. Але, як і ў працах 1950–60-х гг., кола вінаватых у наспяванні крызісу ў краіне летам – восенню 1917 г. было нязменным:

буржуазія, памешчыкі, буржуазна-памешчыцкі Урад, згодніцкія партыі. У рэчышчы такіх падыходаў былі выкананы даследаванні А. Д. Маляўскага «Крестьянское движение в 1917 г.» і Т. В. Осіпавай «Классовая борьба в деревне...».

У 1986 г. выйшла ў свет чарговая праца І. М. Ігнаценкі «Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии». Але, па сутнасці, аўтар паўтарыў асноўныя ідэі «Беднейшего крестьянства...». З гэтага вынікае, што стан вывучэння сялянскай тэматыкі заставаўся на ўзроўні 1962 г., калі не лічыць манаграфіі П. К. Башко «Советы…», дзе прыводзіліся абагульненыя звесткі аб сялянскіх арганізацыях.

Вядома, што праблемы расійскай, беларускай і іншай гісторыі 1917 г. даследаваліся не толькі ў СССР. У выніку перабудовы, калі азначаныя творы зрабіліся здабыткам навуковай грамадскасці, высветлілася галоўным чынам іх антыкамуністычная накіраванасць, аўтары – Л. Волін, Л. Оуэн, Дж. Мэйнард. З адкрыццём «спецсховішчаў» значна ўзбагацілася крынічнае забеспячэнне навуковых пошукаў. У бібліятэках з'явіліся мемуары П. Р. Курлова, У. М. Друцкага-Сакалінскага, а таксама працы замежных аўтараў – Р. Пайпса, Г. М. Каткова і інш.

З атрыманнем Рэспублікай Беларусь суверэнітэту ўзніклі ўмовы для аб'ектыўнага асвятлення мінуўшчыны, а разам з імі і новыя, прыярытэтныя распрацоўкі. Найбольшую на той час увагу ў навуковай грамадскасці выклікалі публікацыі І. М. Ігнаценкі, якія адбівалі яго новыя падыходы да падзей 1917 г. Некаторыя з іх знайшлі ўвасабленне ў яго чарговай манаграфіі [4]. Але, на нашу думку, яна не вызначылася асаблівай навізной. Аўтар некрытычна ацаніў свае папярэднія творы, у характарыстыцы сялянскага руху ён застаўся на ранейшых партыйна-класавых пазіцыях. Гэтыя ж падыходы і ацэнкі навукоўца адбіты ў параграфе «Сялянства ў Лютаўскай рэвалюцыі» вышэй-узгаданай працы «Гісторыя сялянства Беларусі…». З канца XX ст. у нашай краіне не з'явілася практычна ніводнага твору (акрамя асобных прац А. Г. Багдановіч, прысвечаных барацьбе беларусаў за дзяржаўнасць у 1917–1920 гг.), дзе б знайшло аб'ектыўнае асвятленне сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча сялянства Беларусі ў 1917 г. Пэўныя намаганні ў гэтым накірунку прадпрыняў М. Я. Сяменчык.

У апошнія часы айчынная гістарыяграфія Лютага–Кастрычніка істотна не ўзбагацілася. Маладыя гісторыкі пакуль неахвотна выкарыстоўваюць новую метадалогію. Высновы іх дысертацый, як правіла, абапіраюцца на папярэднія, «апрабіраваныя» палажэнні. У ліку такіх аўтараў: А. А. Урбановіч, І. У. Шардыка, М. І. Лобан і інш.

У Расійскай Федэрацыі з адыходам навукоўцаў ад класавых крытэрыяў у ацэнках развіцця расійскага грамадства ў 1917 г. новым прадметам вывучэння становяцца пытанні сацыяльнай псіхалогіі ўдзельнікаў падзей 1917 г., асабліва сялян, у тым ліку ўплыў ментальных архетыпаў сялянскай абшчыны на іх настроі і паводзіны, праблема ўдзелу сялянства ў дзяржаўных органах – валасных, зямельных, харчовых камітэтах (С. М. Арцёмаў, А. І. Дзіндараў, М. Д. Жураўлёва). Прыцягальным аспектам зрабілася культура, побыт, ментальныя асаблівасці расійскага сялянства (А. А. Вілкоў, К. У. Скобелеў [5], С. М. Туталмін); рэалізацыя харчовай і аграрнай палітыкі Часовага ўрада – (Э. У. Пішчэўская, В. В. Лямін).

**Заключэнне.** Такім чынам, праблема сацыяльных паводзін (настрояў, чаканняў, рэакцый) сялянства Беларусі ў трох расійскіх рэвалюцыях мае глебу для разгорнутага навуковага даследавання. У гэтым сэнсе неабходна не адхіляць назапашаны савецкай гістарыяграфіяй вопыт і разам з тым падзяляць дасягненні замежных (у тым ліку расійскіх) аўтараў. Напрыклад, у пошуку новых метадалагічных падыходаў, у звароце да псіхалагічна-ментальных фактараў соцыёгісторыі, паляпшэнні крынічнай базы (аналіз петыцый, зваротаў, прыгавораў сялян), распрацоўцы новай тэрміналогіі.

Мяркуем, што падобны падыход навуковага даследавання будзе адпавядаць прынцыпам грамадскіх навук, а таксама вызначальным палажэнням ідэалогіі нашай дзяржавы

## Літаратура

1. Токць, С.М. Беларуская вёска на мяжы эпох. Змены этнічнай самасвядомасці сялянства ва ўмовах распаду традыцыйнага аграрнага грамадства / С.М. Токць. – Гродна: ГрДУ, 2003. – 190 с.

2. Першая Расійская рэвалюцыя: прычыны, ход, наступствы : матэрыялы Рэсп. навук. канф., Мінск, 27 кастр. 2005 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал. І.І. Багдановіч [і інш.]; навук. рэд. А.П. Жытко. – Мінск, 2005. – 149 с.

3. Лукьянов, Е.П. Крестьянское движение в Белоруссии накануне Великой Октябрьской социалистической революции / Е.П. Лукьянов.– Мінск: Госиздат, 1958. – 176 с.

4. Ігнаценка, І.М. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі: асаблівасці і вынікі / І.М. Ігнаценка. – Мінск: Бел. НДЦДАС, 1995. – 270 с.

5. Скобелев, К.В. Формирование менталитета сибирского крестьянства в эпоху капитализма (1861–1917 гг.): автореф. дис. канд. ист. наук: 07.00.02 / К.В. Скобелев; Омск. гос. ун-т. – Омск, 2002. – 23 с.